Установа адукацыі
«Акадэмія Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь»

Кафедра тэорыі і гісторыі дзяржавы і права

# ПЫТАННІ ДА ЭКЗАМЕНУ

**па вучэбнай дысцыпліне**

# ГІСТОРЫЯ ДЗЯРЖАВЫ І ПРАВА БЕЛАРУСІ

2020

Распрацаваў:
Лапановіч С.Ф., кандыдат гістарычных навук, дацэнт.

Рэцэнзент:
Мурашка А.І., кандыдат гістарычных навук, дацэнт.

## ПОЎНЫ СПІС ПЫТАННЯЎ

1. Прадмет і метадалогія, перыядызацыя і гістарыяграфія гісторыі дзяржавы і права Беларусі.
2. Канцэпцыі паходжання дзяржаўнасці і права. Зараджэнне дзяржаўнасці ўсходніх славян. Полацкае, Тураўскае, Смаленскае і іншыя княствы як першыя дзяржаўныя ўтварэнні на беларускіх землях.
3. Грамадскі і дзяржаўны лад дзяржаў-княстваў на тэрыторыі Беларусі ў раннім сярэднявеччы (IX–першая палова XIII стст.).
4. Характэрныя рысы і сутнасць раннесярэднявечнага звычаёвага і пісанага права.
5. Характарыстыка крыніц права ранняга сярэднявечча. Руская Праўда, Дагавор 1229 г., Статуты («Уставы») кн. Уладзіміра, кн. Яраслава Мудрага, "Кормчая кніга" і іншыя крыніцы права.
6. Навуковыя канцэпцыі ўтварэння Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага. Фарміраванне тэрыторыі дзяржавы, яе адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел ў другой палове XIII– першай палове XVI стст.
7. Грамадскі і дзяржаўны лад Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага ў XIII –першай палове XVI ст.
8. Вышэйшыя органы ўлады Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага ў XIII –першай палове XVI ст. Земскія і дворныя службовыя асобы, іх кампетэнцыя
9. Мясцовыя органы ўлады Вялікага княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага ў XIII – першай палове XVI ст. Сістэма органаў улады, кіравання і суда ў гарадах на магдэбургскім праве.
10. Міжнародныя адносіны Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага з замежнымі дзяржавамі. Унійныя пагадненні з Польскім каралеўствам у канцы XIV – першай палове XVI стст.
11. Судовая сістэма і судаводства Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага ў XIII – першай палове XVI стст.
12. Судовая рэформа Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага 60-х гг. XVI ст. Сістэма паслярэформенных судоў (гродскі суд, земскі суд, падкаморскі суд).
13. Сістэмнае рэфармаванне дзяржаўнага ладу Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага 60-х гг. XVI ст.
14. Агульная характарыстыка прававой сістэмы Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага. Класіфікацыя і аналіз крыніц права дастатутавага перыяду.

15. Агульназемскія, земскія (абласныя) прывілеі і Судзебнік Казіміра Ягайлавіча 1468 г.: гісторыка-прававая характарыстыка.
16. Статуты Вялікага княства Літоўскага 1529 г. і 1566 г. : гісторыка-прававая характарыстыка.
17. Характэрныя рысы асноўных галін права Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага. Крымінальнае права.
18. Люблінская унія Вялікага княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага і Кароны Польскай 1569 г.
19. Грамадскі і дзяржаўны лад беларускіх зямель у складзе Рэчы Паспалітай (1569-1763 гг.).
20. Вышэйшыя органы ўлады і кіравання Рэчы Паспалітай. (1569–1763 гг.).
21. Мясцовыя органы ўлады і службовыя асобы мясцовай адміністрацыі Рэчы Паспалітай (1569–1763 гг.).
22. Судовая сістэма Рэчы Паспалітай. Галоўны Трыбунал ВКЛ: парадак фарміравання і юрысдыкцыя.
23. Канфесійнае становішча ў Вялікім княстве Літоўскім, Рускім і Жамойцкім.
24. Агульная характарыстыка прававой сістэмы Рэчы Паспалітай.
25. Статут Вялікага княства Літоўскага 1588 г. (распрацоўка, зацвярджэнне, крыніцы, сістэма, значэнне).
26. Рэфармаванне дзяржаўнага ладу Рэчы Паспалітай (1763–1795).
27. Чатырохгадовы сойм і Канстытуцыя Рэчы Паспалітай 3 мая 1791 г.: гісторыка-прававая характарыстыка.
28. Прычыны і наступствы падзелаў Рэчы Паспалітай. Паўстанне 1794 г. пад кіраўніцтвам Т. Касцюшкі.
29. Асаблівасці грамадскага і дзяржаўнага ладу Паўночна-Заходняга краю Расійскай імперыі.
30. Органы ўлады і кіравання Расійскай імперыі на тэрыторыі беларускіх зямель.
31. Прычыны правядзення буржуазных рэформаў. Адмена прыгоннага права ў Расійская імперыі і асаблівасці вызвалення сялян на беларускіх землях.
32. Буржуазные рэформы (судовая, земская, гарадского самакіравання) у Расійскай імперыі і асаблівасці іх правядзення ў заходніх губернях.
33. Прычыны і наступствы контррэформаў ў Расійскай імперыі ў апошняй чверці XIX ст.
34. Асаблівасці прававой сістэмы заходніх губерняў Расійскай імперыі. Праект Звода мясцовых законаў заходніх губерняў.
35. Асаблівасці судовай сістэмы Расійскай імперыі на тэрыторыі заходніх губерняў.

36. Рэвалюцыя 1905-1907 гг. ў Беларусі. Скліканне і дзейнасць Дзяржаўнай думы Расійскай імперыі.
37. Беларускія землі ў гады Першай сусветнай вайны. Акупацыя беларускіх зямель Германіяй.
38. Лютаўская рэвалюцыя 1917 г. ў Беларусі. Рэвалюцыйныя пераўтварэнні і беларускі нацыянальны рух.
39. Кастрычніцкая рэвалюцыя 1917 г. і ўсталяванне савецкай улады ў Беларусі. Абласны выканаўчы камітэт Заходняй вобласці і Заходняга фронта.
40. Першы Ўсебеларускі з’езд і яго рашэнні. Брэст-Літоўскі мірны дагавор. Абвяшчэнне Беларускай Народнай Рэспублікі.
41. Абвяшчэнне Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусі ў студзені 1919 г. і Літоўска-Беларускай ССР у лютым 1919 г.
42. Польска-савецкая вайна. Другое абвяшчэнне Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларускі. Рыжскі мірны дагавор.
43. Прававая сістэма ССРБ у 1917–1922 гг. Канстытуцыя ССРБ 1919 г., унясенне ў яе змяненняў і дапаўненнняў.
44. Дзяржаўна-прававыя адносіны ССРБ і РСФСР (1919–1922 гг.). Уваходжанне БССР у склад Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік.
45. Грамадскі лад БССР у 1922–1939 гг.
46. Дзяржаўны лад БССР у 1922–1939 гг.
47. Прававая сістэма БССР у 1922–1939 гг. Развіццё асноўных галін права.
48. Распрацоўка, прынясце і асноўныя палажэнні Канстытуцыі БССР 1927 г.
49. Канстытуцыя БССР 1937 г.: гісторыка-прававы аналіз.
50. Судовы лад і працэсуальнае права БССР у 20-я–30 гг. ХХ ст.
51. Рыжскі мірны дагавор 1921 г. Прававое становішча заходнебеларускіх земель ў Польскай Рэспубліцы.
52. Грамадскі і дзяржаўны лад Польскай Рэспублікі (1918-1939 гг.), палітыка польскіх улад у Заходняй Беларусі.
53. Нацыянальна-вызваленчая барацьба беларускага народа ў Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.).
54. Пачатак Другой сусветнай вайны. Далучэне Заходняй Беларусі да БССР.
55. Пачатак Вялікай Айчыннай вайны. Змены ў дзяржаўным ладзе і прававой сістэме СССР і БССР у час Вялікай Айчыннай вайны.
56. Фашысцкі акупацыйны рэжым ў Беларусі. Палітыка генацыда.
57. Усенародная барацьба савецкага народа з фашысцкімі захопнікамі на акупіраванай тэрыторыі. Партызанскі рух і антыфашысцкае падполле ў Беларусі.
58. Вызваленне тэрыторыі Беларусі ад фашысцкіх захопнікаў. Заканчэнне Вялікай Айчыннай і Другой сусветнай войн.

59. Грамадскі і дзяржаўны лад БССР у другой палове 40-х – сярэдзіне 80-х гг. ХХ ст.
60. Прававая сістэма БССР у 40–80-я гг. ХХ ст. Сістэматызацыя заканадаўства.
61. Распрацоўка, прынядцце і асноўныя палажэнні Канстытуцыі БССР 1978 г.
62. Сістэмны крызіс у СССР. Спробы рэфармавання палітычнай сістэмы.
63. Прававое замацаванне беларускага дзяржаўнага суверэнітэту. Скасаванне СССР.
64. Першая Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь і яе палітыка-прававая эвалюцыя. Рэферэндумы Рэспублікі Беларусь 1995, 1996, 2004 гг.
65. Дзяржаўны лад Рэспублікі Беларусь на сучасным этапе.
66. Прававая сістэма Рэспублікі Беларусь на сучасным этапе.
67. Саюз Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі.
68. Міжнародная дзейнасць БССР і Рэспублікі Беларусь.